Раздзел 2

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў ПАДАННЯХ, ІМЁНАХ І ПАДЗЕЯХ

## 9. КНЯЗЁЎНА З ТРЫМА ІМЁНАМІ

Даўным-даўно, у 10 стагоддзі, у сям'і полацкага **князя** **Рагвалода** нарадзілася дачка. Назвалі дзяўчынку **Рагнедай**. Калі князёўне споўнілася чатырнаццаць гадоў, пасваталіся да яе два браты. Гэта былі вялікі кіеўскі князь Яраполк і наўгародскі князь Уладзімір. Браты паміж сабой не сябравалі.





Рагвалод і Рагнеда


Правообладатель Издательский центр БГУ

Наспявала вайна. Браты разлічвалі, што полацкі князь дапаможа войскам таму з іх, хто стане мужам яго дачкі. Рагнедзе спадабаўся Яраполк, а Уладзіміру яна са згоды бацькі адмовіла. Сваты раз’ехаліся: адны з радаснай весткай у Кіеў, другія — з сумнай весткай у Ноўгарад. Рагнеда чакала лета, калі да яе, па звычаях таго часу, павінен быў прыехаць жаніх.

Ды лёс вырашыў іначай. Уладзімір сабраў вялікае войска і, як толькі сышоў снег, нечакана напаў на Полацк. Бацькі і браты Рагнеды былі забіты, а яе Уладзімір сілай прымусіў стаць сваёй жонкай. Пасля гэтага Уладзімір з войскам рушыў на Кіеў. Вераломна забіў Яраполка і стаў вялікім кіеўскім князем.

Паводле старадаўняга звычаю, жанчына, калі яе бралі замуж, мяняла імя. Рагнеда назвалася **Гарыславай**. У яе нарадзіліся дзеці. Але памяць пра бацьку, маці, братоў не давала спакою. Аднойчы ноччу яна падышла да ложка, дзе спаў Уладзімір, з намерам адпомсціць за родных і Полацк. Але князь прачнуўся, ускочыў і ў лютасці схапіўся за меч. На шум прыбег старэйшы сын **Ізяслаў**. Ён засланіў сабой маці і сказаў: «Бацька, ты тут не адзін!» Князь адступіў, а назаўтра абвясціў наступнае. Малодшых дзяцей Рагнеда не ўбачыць ніколі. А сама яна разам з сынам паедзе ў невялікую крэпасць, якую ён падаруе Ізяславу. Ад яго

Правообладатель Издательский центр БГУ



Рагнеда і Ізяслаў

імя і пайшла назва крэпасці, а пазней горада Заслаўе, што пад Мінскам.

Уладзімір тым часам прыняў хрысціянства — веру ў Ісуса Хрыста — і пачаў хрышчэнне ва ўсіх гарадах. Пры цэрквах пачалі будаваць манастыры. У адзін з іх сышла Рагнеда. Яна стала **манахіняй** пад імем **Анастасіі**. А яе сын Ізяслаў праславіўся як полацкі князь.

Сёння тыя, хто наведвае старадаўняе Заслаўе, прыходзяць да кургана Рагнеды. Яны аддаюць даніну памяці полацкай князёўне-пакутніцы, якая пражыла свой век пад трыма імёнамі. А напамінам аб гэтых гістарычных падзеях стаў помнік Рагнедзе і Ізяславу.

Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй


Правообладатель Издательский центр БГУ

Помнік Рагнедзе
і Ізяславу ў Заслаўі



помнік Рагнедзе і Ізяславу, а таксама горад, дзе гэты помнік узведзены.

1. Што азначае слова «князь»? Выкарыстайце гістарычны слоўнік.
2. Чаму полацкая князёўна атрымала на працягу свайго жыцця ажно тры імёны? Назавіце іх.
3. Каго падтрымаў Ізяслаў словамі: «Бацька, ты тут не адзін!»? Маці ці бацьку? Свой адказ патлумачце.
4. Растлумачце, чаму Рагнеду называюць князёўнай-пакутніцай.
5. Адкуль пайшла назва горада Заслаўе?

Паглядзіце на драўляны меч у руках Ізяслава на малюнку на с. 38 вучэбнага дапаможніка. Гэта дзіцячая цацка ці зброя? Свой адказ патлумачце.

Правообладатель Издательский центр БГУ